*Дзяніс Дук*

# АРХЕАЛАГІЧНЫЯ РАСКОПКІ НА ЗАПАЛОЦКІМ ПАСАДЗЕ СТАРАЖЫТНАГА ПОЛАЦКА

У маі—ліпені 2004 г. праводзіліся археалагічныя раскопкі на тэрыторыі старажытнага Запалоцкага пасада г. Полацка. Дазвол № 1530 выдадзены Інстытутам гісторыі НАН Беларусі на імя старшага выкладчыка Полацкага дзяржаўнага універсітэта Дука Д.У. Раскопкі праводзіліся сіламі навучэнцаў Полацкай нацыянальнай гімназіі і студэнтамі-гісторыкамі І—IV курсаў ПДУ.

Археалагічныя раскопкі ў Запалоцці (сучасны раён Полацка) археалагічным атрадам ПДУ праводзіліся ўпершыню (за выключэннем шурфоўкі ў 2003 г.). Прычынай гэтаму сталі, па-першае, вынікі праведзенай у маі 2004 г. археалагічнай разведкі, па-другое, рэстаўрацыйныя работы ў дворыку былога Езуіцкага калегіума — месцы раскопаў 2000—2003 гг.

У параўнанні з Вялікім пасадам і Верхнім замкам Запалоцкі пасад археалагічна вывучаны адносна слаба — пераважна ў межах сучаснай грамадзянскай забудовы. Археалагічная разведка па-за межамі Запалоцця была праведзена С. В. Тарасавым у 1986—1987 гг.

У 1986 г. на 60 м ад паўночна-заходняй ускраіны Запалоцця (мал. 1) С. В. Тарасавым быў закладзены шурф, у якім вызначана наяўнасць культурнага пласта 0,8—1,0 м "з высокай насычанасцю матэрыяламі часоў Полацкай зямлі і амаль поўнай адсутнасцю больш позніх матэрыялаў" (Тарасаў, 1998, с. 28). Ва ўроч. Капанка за 500—600 м на паўночны захад ад Запалоцкага пасада С. В. Тарасаў лакалізаваў рэшткі паселішча на пляцоўцы памерамі 100 х 200 м. Даследчык прыйшоў да высновы аб наяўнасці тут паселішча-спадарожніка (сельскагаспадарчага прадмесця горада), часткова пашкоджанага кар'ерам (Памяць, 2002, с. 48; Тарасаў, 1998, с. 94).

Сапраўды, кар'ерам у 1972 г. была знішчана частка пасялення, але, як ні парадаксальна, — культурны пласт захаваўся. Відаць, пласт быў вялікай магутнасці і не падыходзіў для будаўнічых патрэб. Яго ссунулі на поўдзень ад кар'ера бульдозерам, пасля чаго ўтварыўся штучны пагорак вышынёй 2,5—3 м, на месцы якога намі быў закладзены шурф 4 (2 х 2 м). Магутнасць перамешанага культурнага пласта тут складала 2,5 м (усяго 3 м), пласт утрымліваў матэрыялы X—XVIII стст. з перавагай рэчаў часоў Полацкай зямлі. Па сведчаннях мясцовых жыхароў, гэты культурны пласт паходзіў з высокай гары, якая была цалкам разабрана для патрэб будаўніцтва мікрараёна Полацка па вул. Марыненка.

Не выключана, што гэтая гара з магутным культурным пластом магла адыгрываць ролю гарадзішча на заходняй ускраіне старажытнага Полацка. Захаванасць культурнага пласта прадстаўляе патэнцыяльную магчымасць археалагічнага вызначэння храналогіі і асартымента рэчаў, сацыяльнага статуса і заняткаў насельніцтва.

Археалагічныя раскопкі і разведка 2004 г. паказалі, што паселішча, адкрытае С. В. Тарасавым у 1987 г., з'яўлялася паўночна-заходняй ускраінай старажытнага Запалоцкага пасаду. Сам Запалоцкі пасад у X—XII стст. быў удвая большы за сучасны (сёння заходняя мяжа Запалоцця з прыватнай забудовай праходзіць па вул. Гастэлы). Старажытнае Запалоцце размяшчалася на правым беразе Дзвіны ад вусця Палаты да т. зв. уроч. Капанка, г. зн. на 600 м на захад ад вул. Гастэла. Пасад уключаў ў сябе частку закінутага кар'ера разам з "паселішчам", адкрытым раней (мал. 1).

Помнік, на якім праводзіліся раскопкі, размешчаны на высокім правым беразе Дзвіны і ўяўляе сабой роўную пляцоўку, памерамі прыкладна 600 х 350 м, засеяную кармавымі травамі. Гэтае плато мае роўную паверхню, па якому на адлегласці ад 50 да 100 м да Дзвіны пракладзена меліярацыйная траншэя. У заходняй частцы траншэя злучана з прыродным ровам, а праз гэты роў — з Дзвіной (мал. 1). Візуальна культурны пласт не фіксуецца, паколькі тут ён прадстаўлены аднароднай светла-шэрай зярністай супессю жаўтаватага адцення. З захаду натуральнымі межамі пляцоўкі з'яўляецца прыродны глыбокі роў, з усходу — шчыльная забудова сучаснага Запалоцця, з поўначы мяжа няпэўная, яна была вызначана толькі шляхам правядзення шурфоўкі.

З мэтай высвятлення плошчы распаўсюджвання і інтэнсіўнасці культурнага пласта з матэрыяламі часоў Полацкай зямлі намі было закладзена 8 шурфоў (мал. 1). Шурфы 1—3 размешчаны прыкладна па адной лініі на аддаленасці каля 30 м ад Дзвіны на агульную адлегласць ад Запалоцця 500 м, што адпавядае лініі размяшчэння меліярацыйнай траншэі і першага рова (мал. 1). Другі роў знаходзіцца на адлегласці 150 м, на захад ад яго характар мясцовасці мяняецца, яна становіцца пагоркавай, культурны пласт на ёй адсутнічае.

Шурфы 1—3 паказалі, што на рознай адлегласці ад заходняй мяжы сучаснага Запалоцця крытэрыі вызначэння культурнага пласта аднолькавыя. Яго магутнасць у сярэднім 0,8—1 м, месцамі да 1,4 м.

Шурфы 5—8 маркіруюць паўночныя межы пляцоўкі. Яны размешчаны па адной лініі ад паўночна-заходняй ускраіны сучаснага Запалоцця да былога кар'ера на адлегласці каля 350 м ад Дзвіны. Характар культурных напластаванняў у іх адрозніваецца толькі магутнасцю (каля 0,6 м), стратыграфія і структура пласта аналагічная шурфам 1—3.

Раскоп 1 (140 кв. м) вырашана разбіць на заходняй ускраіне зоны распаўсюджвання культурнага пласта на адлегласці каля 550 м ад забудовы Запалоцця побач з ровам 1. Мэта раскопак — вызначэнне месца пасялення ў тапаграфічнай структуры старажытнага Полацка, працягласці яго існавання, характару забудовы і этапаў развіцця.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова




*Мал. 1. План Полацка з пазначэннем Запалоцця і тэрыторыі археалагічнага даследавання 2004 г.*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

У раскопе 1 даследаваны рэшткі абарончых збудаванняў старажытнай сцяны пасада. Ва ўсходняй частцы раскопу зафіксаваны рэшткі васьміграннай вежы, якая перакрывала лінію частаколу. Паводле стратыграфіі, абарончыя збудаванні адлюстроўваюць пачатковы этап асваення дадзенай тэрыторыі. Абарончая вежа і частакол загінулі ў моцным пажары.

Храналогія археалагічных знаходак, сярод якіх вылучаюцца мілітарыі, біжутэрыя, прадметы побыту і рамесны інструмент, дазваляе вызначыць час засялення і працягласць існавання заходняй часткі пасада ў межах X—XII стст.

Такім чынам, падчас раскопак і разведак 2004 г. было вызначана, што ў X—XII стст. плошча Запалоцкага пасада, а адпаведна і старажытнага Полацка, была большая, як мінімум, на 21 га, і ў гэтыя часы пасад меў агульную плошчу не менш за 40 га. Вылучаны культурны пласт з матэрыяламі X ст. дазваляе разглядаць Запалоцкі пасад як адзін з самых старажытных пасяленняў у тапаграфічнай структуры горада. У X—XI стст. пасад быў умацаваны драўляным частаколам, меў абарончыя вежы і размяшчаўся ўздоўж Дзвіны на 1300 м на захад ад вусця Палаты. У XIII ст. адбываецца скарачэнне тапаграфічнай структуры Запалоцкага пасада, ён дасягае сучасных межаў, а заходняя яго частка застаецца па-за межамі гарадской забудовы да нашых дзён.

Вынікі, атрыманыя пасля правядзення раскопак у 2004 г., дазваляюць паставіць пытанне аб дзяржаўнай ахове адкрытага археалагічнага помніка і наданні дадзенай тэрыторыі статуса ахоўнай зоны Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка.

ЛІТАРАТУРА

Памяць. Гіст.-дакум. хроніка Полацка, 2002. Мн.

*Тарасаў С. В., 1998.* Полацк IX—XVII стст.: гісторыя і тапаграфія. Мн.

тронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулеш